Badania dialektów i onomastyki
na pograniczu polsko-wschodnio-
słowiańskim
Białystok 1995

ФЁДАР КЛІМЧУК
Мінск

# АБ СУАДНОСІНАХ ГАВОРАК БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ І ПАДЛЯШША

Усходнеславянскія гаворкі Падляшша (Беластоцкае і Бяла-Падляшскае ваяводствы РП) тэрытарыяльна з'яўляюцца працягам гаворак Заходняга Палесся. Таму натуральная актуальнасць даследавання суадносін гаворак абодвух рэгіёнаў.

Найбольш рэлевантныя асаблівасці, на падставе якіх праводзіцца групоўка гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся, наступныя: рэфлексы пад націскам -о- ў новых закрытых складах (*о, у͡о, ô, у, ӥ, і, е*), -*ě*- (*е, і͡е, і*), -*'а*-, -*ę*- (*'а, 'е*), -*е*-, -*ъ*- (*е, а*), -*ы*-, -*і*- (*ы, і, е*), рэфлексы -*е*-, -*ъ*-, -*ę*- ў паслянаціскных складах (*е, ы, і*), оканне-аканне, цвёрдасць-мяккасць губных і пярэднеязычных перад -*е*-, -*і*-, цвёрдасць-мяккасць -*р*-, -*ц*-, шыпячых, заднеязычных[1].

Гаворкі Брэсцка-Пінскага Палесся, паводле адзначаных і шэрагу іншых рыс, у першую чаргу дзеляцца на так званыя паўночнабрэсцкія і ўласна брэсцка-пінскія або загародскія.

Паўночнабрэсцкім гаворкам характэрна оканне (акрамя гаворак паўночна-заходняй Пружаншчыны, у якіх пашырана аканне), мяккасць пярэднеязычных перад -*е*-, -*і*-, губных перад -*і*-, цвёрдасць губных перад -*е*-, цеканне-дзеканне, формы тыпу *бада́, васна́, машо́к, пасо́к*, пратэтычны -*в*- у займенніках 3-й асобы (*вон, вона́, воно́, воны́*), неазначальная форма дзеясловаў на -*ці* (*ходзіці, косіці*) і шэраг іншых. Паўночнабрэсцкія гаворкі ў пэўнай меры з'яўляюцца пераходнымі паміж загародскімі і панямонскімі, хоць безумоўна бліжэй да апошніх. Некаторыя факты[2] даюць падставы меркаваць, што

---

1 Ф. Д. Клімчук, *Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс*, Мінск 1983.

2 Я. Р. Самуйлік, *Некаторыя асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся*, (у:) "Беларуская лінгвістыка", вып. 32, Мінск 1987, с. 49-55.

паўночнабрэсцкія і загародскія гаворкі ґенетычна ўзыходзяць да розных плямённых дыялектных адзінак. Блізкія паўночнабрэсцкія гаворкі да гаворак усходнепалескіх (тураўскіх). У межах РП[3] паўночнабрэсцкія гаворкі пашыраны ў Белавежскай і Нараўкаўскай гмінах Беластоцкага ваяводства.

Гаворкі цэнтральнай Беласточчыны (ім, у прыватнасці, характэрна оканне) у пэўнай ступені з'яўляюцца пераходнымі паміж панямонскімі і паўночнабрэсцкімі.

Найбольш характэрныя рысы загародскіх або ўласна брэсцка-пінскіх гаворак: рэфлекс націскнога *-ě-* > *і* (*сн'іг, б'ілый*), рэфлексы націскнога *-о-* ў новых закрытых складах > *і, ы, ӥ, у* (*в'ін, вын, в'ӥн, вун*), цвёрдасць губных і пярэднеязычных перад рэфлексамі *-е-, -і-* (*дэн' , бэ́рог, робы́ты*), адсутнасць цекання-дзекання (*д'івчына, т'ін', т'агну́ты*). У межах Польшчы (Беластоцкае і Бяла-Падляшскае ваяводствы) тыповыя загародскія гаворкі на захадзе абмяжоўваюцца лініяй: Вітава, Кляшчэлі, Няміраў, Янаў Падляскі, на захад ад Ракітна, Тучны, Ганны, Уладавы. Займаюць яны нешырокую паласу на мяжы з Брэсцкай вобласцю Беларусі.

У загародскіх гаворках выдзяляюцца чатыры групы або тыпы: гаворкі сярэднезагародскія, паўночна-ўсходнія загародскія, паўднёвазагародскія і тараканскія. Найбольш характэрныя асаблівасці, паводле якіх гэтыя групы выдзелены, наступныя: розная рэфлексацыя пад націскам этымалагічнага *-о-* ў новых закрытых складах (*і, ы, ӥ* або *у*), этымалагічных *'а, ę* (*'а* або *'е*), *-е-, -ъ-* (*е* або *а*), розны характар цвёрдасці-мяккасці *-р-, -ц-*, шыпячых. У межах Польшчы вядомы тры тыпы загародскіх гаворак: паўднёвазагародскі (вымаўленне тыпу *в'із, к'ін', вз'ев, т'е́жко*), паўночна-ўсходні загародскі (вымаўленне тыпу *вуз, кун' , вз'ав, т'а́жко*), сярэднезагародскі (вымаўленне тыпу *в'із, в'ӥз, к'ін', к'ӥн' , вз'ав, т'а́жко*).

Паміж паўночнабрэсцкімі і загародскімі гаворкамі ёсць гаворкі пераходныя: верхнеясельдскія, малецкія, паўднёвацеляханскія, паўночналагішынскія, бобрыкскія, лунінскія, беражноўскія, сярэднепагарынскія. Па характару рэалізацыі *-д-, -т-* перад *-е-, -і-* (> *і, ы*) гэтыя гаворкі падзяляюцца на чатыры групы. Першая група

3 W. Kuraszkiewicz, *Ruthenica. Studia z historycznej i współczesnej dialektologii wschodniosłowiańskiej*, Warszawa 1985, stron 313 + mapy); M. Kondratiuk, *Wokalizm białorusko-ukraińskich gwar powiatu hajnowskiego*, [w:] "Slavia Orientalis" XIII /1964/, s. 339—356); *Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny*, t. 1. Pod red. S. Glinki, A. Obrębskiej-Jabłońskiej i J. Siatkowskiego, Wrocław 1980, tom II—III, pod red. S. Glinki, Wrocław 1989—1993.

— *-д-, -т-* перад *-е-, -і-* цвёрдыя (вымаўленне тыпу *дэн', ходыты*), гаворкі малецкія і паўночналагішынскія. Да гэтага ж тыпу можна аднесці так званыя ўсходнепадляшскія гаворкі ў Беластоцкім і Бяла-Падляшскім ваяводствах РП. Іх усходняя мяжа — гэта граніца з тыповымі загародскімі гаворкамі. Паўночна-заходняя і заходняя іх мяжа праходзіць на ўсход ад Гайнаўкі, на поўнач ад Чыжоў, на захад ад Орлі, на ўсход ад Мельніка, на захад ад Канстанцінава, на поўнач і ўсход ад Бялай Падляскі, на ўсход ад Ламазаў і Парчава. Адзначаны дыялектны тып у межах Заходняга Палесся і Падляшша можна лічыць перыферыйнымі загародскімі гаворкамі. Гаворкі гэтага тыпу можна нават суаднесці з асобнымі групамі загародскіх гаворак, менавіта, паўночна-ўсходнімі загародскімі (вымаўленне тыпу *вз'ав, т'áжко*) і паўднёвазагародскімі (вымаўленне тыпу *вз'ев, т'éжко*).

Другая група пераходных гаворак паміж паўночнабрэсцкімі і загародскімі — *-д-, -т-* перад *-е-* цвёрдыя, перад *-і-* — мяккія (вымаўленне тыпу *дэн',ход'іт'і*): гаворкі сярэднепагарынскія і паўднёвацеляханскія. Да гэтага тыпу ў Беластоцкім і Бяла-Падляшскім ваяводствах адносяцца так званыя заходнепадляшскія гаворкі. Іх мяжа на захадзе — гэта заходняя мяжа ўсходнеславянскіх гаворак у Польшчы. На ўсходзе яны мяжуюць з усходнепадляшскімі гаворкамі, пра якую гаварылася вышэй. Паўночная іх мяжа праходзіць на ўсход ад Гайнаўкі, на поўнач ад Нарвы і Храбалоў.

Трэцяя група — *-д-, -т-* перад *-е-* цвёрдыя, перад *-і-* перайшлі адпаведна ў *-дз'-, -ц'-* (вымаўленне тыпу *дэн', ходз'іц'і*): гаворкі верхнеясельдскія. На Беласточчыне да гэтага тыпу адносіцца невялікая група гаворак на ўсход ад г. Нарва (вв. Гароднікі, Іванкі, Сакі, Крыніца і інш.).

Чацвёртая група — *-д-, -т-* перад *-е-, -і-* мяккія (вымаўленне тыпу *д'ен, ход'іт'і*): гаворкі бобрыкскія, лунінскія, беражноўскія. Гаворкі падобнага фанетычнага тыпу сустракаюцца на крайнім паўднёвым захадзе Падляшша: вв. Прухэнкі, Аструўкі, Дратуў, Каняволя.

Такім чынам, параўнальна невялікую частку Падляшша займаюць гаворкі тыповыя для Брэсцка-Пінскага Палесся — загародскія і паўночнабрэсцкія. Асноўная ж частка ўсходнеславянскіх гаворак Падляшша па фанетычных рысах блізкая да тых ці іншых груп пераходных гаворак паміж загародскімі і паўночнабрэсцкімі (і тураўскімі). Разглядаемыя пераходныя гаворкі займаюць пераважна вузкую паласу, якая нярэдка перарываецца. На захадзе гэтая паласа надзвычай расшыраецца і ахоплівае вялікую вобласць заходняга Падляшша ад р. Нараў на поўначы да г. Парчава на поўдні. Пучок ізаглос, які раздзяляе загародскія і паўночнабрэсцкія гаворкі ў раёне Белавежскай пушчы раздзяляецца. Адна частка ізаглос гэтага пучка

працягваецца на паўночны захад, другая частка — на паўднёвы захад. Прынята лічыць, што разглядаемыя пераходныя гаворкі ўтварыліся ў выніку ўзаемадзеяння загародскіх і паўночнабрэсцкіх гаворак. Адмаўляць такога ўзаемадзеяння вядома нельга. У той жа час разгледжаны дыялектны ландшафт Заходняга Палесся і Падляшша дае падставы лічыць, што фарміраванне гэтых гаворак больш складанае.




т т т т т т оканне
– – – – – – рэфлекс ѣ > і пад націскам
∿∿∿∿∿ цеканне-дзеканне
+ + + + + + цвёрдасць губных перад е
—×—×—× цвёрдасць д, т, з, с, н перад е
—‖—‖—‖ цвёрдасць д, т, з, с, н перад рэфлексамі і

*Fiodor Klimczuk*

O STOSUNKU GWAR BRZESKO-PIŃSKIEGO POLESIA DO GWAR PODLASIA

Streszczenie

Wschodniosłowiańskie gwary Podlasia (terytorium woj. białostockiego i bialsko-podlaskiego) stanowią kontynuację gwar brzesko-pińskiego Polesia. Na terytorium Polesia największy obszar zajmują gwary brzesko-pińskie i zagorodskie.

Na Podlasiu typowe gwary zagorodskie zamykają się w granicach wyznaczonych przez następujące miejscowości: Witowo, Kleszczele, Niemirów, Janów Podlaski, na zachód od m. - Rokitno, Tuczna, Hanna, Włodawa. Na zachodzie graniczą z nimi gwary wschodniopodlaskie, które stanowią jedną z odmian peryferyjnych gwar zagorodskich. Ich granica przebiega następująco: Hajnówka, na północ od Czyż, na zachód od Orli, na wschód od Mielnika, na zachód od Konstantynowa, na północ i wschód od Białej Podlaskiej, na wschód od Łomazów i Parczewa. Na zachód i północny zachód od gwar wschodniopodlaskich rozprzestrzenione są gwary zachodniopodlaskie (rejon Bielska, Siemiatycz, Białej Podlaskiej, Parczewa). Ze względu na cechy fonetyczne są one podobne do gwar południowo-cielechańskich i środkowopogoryńskich na Polesiu brzesko-pińskim. Gwary wsi Ogrodniki, Iwanki, Saki, Krynica, które zajmują obszar na wschód od miasteczka Narew, pod względem fonetycznym są zbliżone do górnojasieldzkich gwar obwodu brzeskiego. Gwary wsi Próchenki, Ostrówki, Dratów, Koniawola w południowo-zachodniej części Podlasia ze względu na cechy fonetyczne są podobne do gwar bereżnowskich, łunińskich, bobryckich w obwodzie brzeskim.

W północnej części Polesia brzesko-pińskiego funkcjonują gwary północnobrzeskie. W województwie białostockim spotykamy je w gminie Białowieża i Narew.